# МАТЫЎ ЗАГУБЛЕНАГА ЭДЭМУ Ў «ПАЛЕСКАЙ» ПРОЗЕ І. МЕЛЕЖА І В. КАЗЬКО

Палессе ў нацыянальнай літаратурнай традыцыі здаўна мела статус запаветнай зямлі, дзе ад пачатку пяршатварэння захавалася некранутая прырода, дзе рука чалавека яшчэ не сцерла праявы волі Творцы. Жыццё яго насельнікаў нялёгкае і небагатае, але па ўменні падладзіцца пад прыродныя рэаліі, па прынцыпах мірнага сужыцця чалавека і навакольнага свету нагадвае своеасаблівы зямны Эдэм, дзе ўсё падпарадкавана законам вечнабыту, усё знаходзіцца ў суладдзі паміж сабой і стварае гарманічную экапрастору. Палессе, адмежаванае ад вялікага свету непраходнымі балотамі і лясамі, мела свой адметны ўстойлівы хранатоп з уласцівымі яму замкнёнасцю, архаічнасцю, кансерватызмам, чым вабіла этнографаў і фалькларыстаў, пісьменнікаў, мастакоў, фатографаў. Менавіта праз гэтыя рысы хранатоп Палесся так цяжка і пакутліва разбураўся на працягу XX стагоддзя пад ціскам тэхнагеннай цывілізацыі і сацыяльных эксперыментаў. У сучаснай беларускай мастацкай экалітаратуры Палессе мае настальгічнае і трагічнае асэнсаванне як сімвал загубленага чалавекам зямнога Раю.

Матывы перасцярогі, трывожнага роздуму пра выгоды і страты навукова-тэхнічнага прагрэсу выявіў Янка Лучына ў паэме «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся». Іван Мележ у «Палескай хроніцы» ўпершыню ў беларускай літаратуры не толькі ўсебакова паказаў адметнасць Палесся, менталітэт і светаадчуванне сваіх землякоў, але і аналітычна прасачыў пачатак разбурэння палескага хранатопу. Яшчэ ў 1946 годзе, паспеўшы надрукаваць некалькі апавяданняў, у дзённікавых запісах ён акрэслівае творчыя планы: «Напісаць вялікую рэч (калі-небудзь) пра тое, як змянялася і ламалася псіхіка беларускага селяніна з 1914 года па сённяшні дзень…». У шырокім эпічным палатне «Палескай хронікі» пісьменнік на фоне грамадска-палітычных узрушэнняў ва ўсёй паўнаце і цэласнасці паказвае традыцыйны свет сваіх герояў-палешукоў, іх духоўную сувязь з зямлёй, глыбіннае адчуванне лучнасці са светам жывой прыроды.

Каб падкрэсліць устойлівасць і традыцыйнасць жыцця палескай вёскі Курані, пісьменнік выкарыстоўвае цыклічную кампазіцыю. І. Мележ паказвае сваіх герояў у іх натуральнай аўтэнтычнай прасторы, пазначанай адзінствам прыродных і культурных рэалій. У першай кнізе «Палескай хронікі» паўнапраўнымі жыхарамі побач з людзьмі выступае розная жамяра, паўзучыя гады, птушкі, жывёлы. Гэта адзінства чалавека і прыроды, адчуванне сябе часткай вечнага колазварота ўсяго жывога на зямлі ёсць і ў іншых кнігах цыкла, напрыклад, у пранікнёна апісанай працы куранёўцаў на полі падчас

касавіцы ў рамане «Подых навальніцы». На поле сяляне выязджаюць сем'ямі, працуюць, адпачываюць, размаўляюць пра набалелае, надзённае і глядзяць на адвечнае зорнае неба над галавой: *У турбоце, у знямозе старэлі дужыя хлопцы і маладзіцы, прыходзілі на змену новыя, такія ж дужыя, поўныя надзей, каб аддаць тут дужасць, маладосць сваю. Цэлыя таварыствы, пакаленні цэлыя змяняліся, як трава скошаная – маладой, сакавітай; нязменна, неўміруча высілася толькі неба – сіняе, хмарнае, з зорамі* [4, с. 92]. Смерць і нараджэнне для куранёўцаў – закладзеныя вечнабытам натуральныя з'явы, якія аднолькава дзейнічаюць і ў прыродзе, і ў чалавечым жыцці.

Героі І. Мележа не супрацьпастаўляюць сябе свету, а арганічна ўключаюцца ў яго як частка аднаго цэлага. У гэтым сэнсе пісьменнік стварае вобраз спраўнай экасістэмы, дзе ўсе часткі прыцерліся адна да адной, выпрацавалі стабільныя законы сужыцця. Людзі ў Куранях жывуць як быццам паасобку, кожны сваім дваром, але ўсе падпарадкоўваюцца агульным законам, запісаным у калектыўным бессвядомым, і гэта лучыць іх у адну супольнасць. Невыпадкова, апісваючы жыццё куранёўцаў, аўтар часта ўжывае множны лік і безасабовыя сказы – *аралі, баранавалі, сеялі* – і на фоне гэтага агульнага жыцця прасочвае індывідуальныя лёсы сваіх герояў. Іх жыццё знітавана і даўнімі культурнымі традыцыямі, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Мележ апісвае святкаванне Калядаў, змовін, вяселля, традыцыйныя кірмашы, перадае шматгалоссе і непаўторную прыгажосць жыцця палескай вёскі.

У хрысціянскай культуры Эдэм разумеўся як замкнёная прастора, адусюль агароджаная і адасобленая ад знешняга хаосу. Гэта ўнутраная прастора ўсведамлялася як спарадкаваная, абжытая, цалкам прымальная і ўтульная для яе насельнікаў. Адчуванне замкнёнасці, інтравертнасці Палесся пісьменнік стварае на пачатку рамана параўнаннем Куранёў з востравам, адасобленым ад усяго свету балотамі: *Багна, якая страшэнна разбухала ад слоты і разводдзя, адрэзала востраў ад свету мацней, чым гэта маглі б зрабіць абшары вадзянога прастору. Многія дні людзі жылі, як на плыце, які злая нягода адарвала ад берагу і занесла ў мора, – трэба пачакаць адно, калі спадарожны вецер ці лёс зноў падгоніць да зямлі* [3, с. 6]. Тым не менш балота не антаганістычна чалавеку. Мележ часта палохае чытача тванню, дрыгвой, але і любуецца яе прыгажосцю, воднымі разлівамі, сакавітымі колерамі палескай зямлі. Стары Чарнушка, якога голад прымусіў перабрацца сюды з Украіны, так і застаўся тут, у палоне Палесся: *Назаўсёды забрала сабе душу яго... зманлівая, няласкавая да дзяцей сваіх красуня* [4, с. 252].

Балота вызначыла выключную інтравертнасць мясцовага жыцця. Яно адмяжоўвала ад свету, але і ахоўвала ад шкодных уплываў спажывецкай цывілізацыі, якая рабіла з чалавека хіжага драпежніка. Балота кансервавала даўнія, пракаветныя традыцыі, няпісаныя законы мірнага існавання чалавека і прыроды. Сапраўдныя палешукі ў Мележа – гэта традыцыяналісты

і кансерватары большыя, чым жыхары іншых куткоў Беларусі. Разам з тым, ім уласціва адчуванне вышэйшасці над астатнім светам, якое добра відаць з палескай прымаўкі: *А за Гомелем людзі е? – Е. Толькі дробненькія*. Змагацца з балотам, на думку палешукоў, безвыніковая справа: *Што бог даў, тое адзін бог і перамяніць можа! А не чалавек, казяўка,* – кажа Дамеціха, гераіня-ахоўніца даўніх звычаяў [3, с. 152].

Інтравертнасць Палесся падмацоўваецца вобразамі дарог і сцежак, па якіх ходзяць, сустракаюцца, а часцей хаваюцца адзін ад аднаго героі. Палескія сцежкі-дарожкі лабірынтападобныя, у іх адсутнічае рацыянальная прамая лінія, якая сёння дамінуе на асушаных палескіх балотах у выглядзе меліярацыйных каналаў. Напрыклад, Васіль, ідучы дадому *каля Глінішчаў, сышоў са шляху, узяўся проста на Курані. Хоць мог ісці і сялом, знарок абмінуў яго, каб не сустракацца з людзьмі, падаўся сцежкаю па полі, паўз могілкі. Абышоў падмерзлым узболаткам і Алешнікі, зрэзаў вялікі круг* [3, с. 119].

Любы замкнёны хранатоп рана ці позна ўступае ў канфлікт з хадой гісторыі і ў выніку наканаваны на разбурэнне. У кожным Эдэме патэнцыяльна закладзена спакуса грэхападзення і яго страты ў выніку праяўленай волі чалавека. Мележ аналізуе тыя з’явы, якія прыводзяць да кардынальных зменаў унікальнага свету Палесся, аналізуе набыткі і ахвяры на шляху гэтага працэсу. Пасіянарныя памкненні новага часу ўзрушваюць стабільнае жыццё палешукоў. Гаворка вяскоўцаў памалу выходзіць за межы «куранёўскай рэспублікі» і сягае ўжо да Глінішчаў, Мазыра, нават да Масквы. Пабудова грэблі – гэта пачатак разбурэння паляшуцкага традыцыйнага быту, далучэння да агульнага жыцця краіны. Мележ паступова пашырае мастацкую прастору раманнага цыкла: калі ў першай кнізе дзеянне было замкнёна амаль выключна ў Куранях, то наступныя часткі напоўнены пастаянным рухам, перамяшчэннямі герояў па розных дарогах аж да самога Мінска.

У новым часе адбываецца рост асобы, яе вылучэнне з агульнай вясковай грамады, бунт супраць устойлівых сялянскіх традыцый. Нечуваны розгалас у Куранях набыў сыход Ганны ад мужа, чаго ніколі не было на памяці вяскоўцаў. У Ганны хапае ўнутранай сілы пайсці супраць няпісаных законаў, якія вызначалі жыццё вясковай супольнасці.

Іван Мележ паказвае, як гэтыя непазбежныя змены ў замкнёным і інтравертным палескім жыцці гвалтоўна паскараюцца грамадска-палітычнымі і сацыяльнымі эксперыментамі, валюнтарызмам, безразважлівай барацьбой са старымі традыцыйнымі каштоўнасцямі. Гэты працэс ламае чалавечыя лёсы, стабільныя сувязі чалавека з навакольным асяроддзем, разрывае яго крэўную сувязь з зямлёй. Бязлітасна знішчаецца ўстойлівая экапрастора Палесся. Пісьменнік пастаянна сутыкае герояў-традыцыяналістаў з героямі-рэфарматарамі Апейкам, Міканорам, Башлыковым.

Апейка сам паляшук, і зацятае супраціўленне землякоў любому новаўвядзенню, ахова імі свайго свету яму зразумелыя. *Не здзіўляла яго і тое, што ім так шкада было затхлага спакою: той, хто век жыве на балоце, не мог не прывыкнуць да ядавіта-зялёнага хараства раскі* [3, с. 171]. Але як адукаваны чалавек, настаўнік, ён перакананы, што чалавеку патрэбны свет цэлы. Гуманістычныя памкненні становяцца рухавіком яго настойлівай працы па перайначванні палескага жыцця. Надзеі, што калі-небудзь гэты глухі край *стане краем багацця і культуры*, кампенсуюць страту ягонай адметнасці.

Больш зацятаму рэфарматару, Міканору, пасля службы ў войску старыя вясковыя звычкі і сялянскія традыцыі падаюцца як *шкоднае пустазелле*, якое належыць бязлітасна выкараніць. *Асветы, кіно, газетаў сюды*, – марыць ён. Але хаця Міканор і супрацьстаіць традыцыяналісцкаму свету вёскі, усё роўна часткова прыналежыць яму, звязаны з ім крэўнымі, чалавечымі сувязямі. Ён мімаволі ўцягваецца ў калаўрот спрадвечных сялянскіх святаў, завядзёнак, будзённых спраў і часта не ў стане супраціўляцца магутнай інерцыі свету старога Палесся.

Найбольш бязлітасным разбуральнікам выступае ў творы Башлыкоў. Мележ неаднаразова падкрэслівае, што ён гараджанін, прыхадзень, які не можа адрозніць жыта ад грэчкі, і ўсё традыцыйна-вясковае, спецыфічна-паляшуцкае выклікае ў яго непрыманне і нянавісць. Гэта нянавісць узнікла даўно, калі *ў галодныя гады ў горад сяляне на кірмаш прывозілі прадукты і, як здавалася, бесчалавечна дралі з іх, гарадской беднасці* [5, с. 161]. Свет палескай вёскі для яго варожы і чужы, *гэта тое, што належала зрушыць. І што не хацела зрушвацца.* Традыцыяналізм сялянства раздражняе і нервуе Башлыкова: *павёў позіркам па хаце, нібы нанава ўбачыў беднасць, убоства яе, гэтага іх «раю», які яны так аберагаюць; варухнулася цяжка, няцямна: чаго яны так чапляюцца за гэта?! Не мог уразумець гэтага* [5, с. 133].

Не толькі людзі, але і сама прырода Палесся адчувае яго нянавісць і адказвае яму супрацівам. Невыпадкова аднойчы снежаньскай ноччу ў дарозе Башлыкову падалося, быццам у недалёкіх кустах затаілася нешта варожае і, здавалася, рыхтавалася стрэліць у яго. *Неспакойнае было ў бегу коней, у няспынным дзікім варушэнні быльнягу абапал дарогі, на межах, у самім няроўным, кідкім ветры… тое, што ён хацеў лічыць прывідамі, жыло, варушылася, рыхтавалася* [5, с. 69]. Гэты ірацыянальны момант падкрэслівае антаганізм Башлыкова ўсяму цэласнаму свету Палесся.

Сацыяльны эксперымент, які разбурае традыцыйны гарманічны свет Палесся, пераходзіць у маральна-этычную плоскасць, выклікае крызіс духоўнага жыцця палешукоў, прыводзіць да разбурэння старой каштоўнаснай сістэмы, якая вызначала міжчалавечыя ўзаемаадносіны. Усё больш злосці з’яўляецца паміж аднавяскоўцамі, усё больш чалавечых канфліктаў, культывуецца зайздрасць да тых, хто багацейшы, пачуццё помслівасці

і злараднасці. Башлыкова раздражняюць праявы чуласці і шкадавання да людзей, якія ён бачыць у старой Дамеціхі. *Жаласці дурной у людзей аж залішне! Крывасмокаў самых яўных то не судзяць, то – шкадуюць! І каб адзін-два, з дабраты шчодрай, а то ж – не ў адной вёсцы! Чуласць гэтая!..* [5, с. 128]. Мележ падрабязна, з уласцівым яму псіхалагізмам, паказвае гэта парушэнне «экалогіі душы».

Разбураецца традыцыйны свет палешукоў, знішчаецца іх аўтэнтычная культура, іх экапрастора, якая ўтрымлівае ў сабе не толькі нормы ўзаемаадносін чалавека і прыроды, але і стагоддзямі выпрацаваны лад жыцця ва ўстойлівых рытмах, з будзёнымі клопатамі і святамі. Непрымірымыя рэфарматары агрэсіўна выступаюць супраць усімі любімых святаў Калядаў, Новага года, абвяшчаючы іх састарэлымі і шкоднымі. Адбываецца і знішчэнне такіх бясспрэчных каштоўнасцяў, як духоўная сувязь чалавека з зямлёй. Для Васіля Дзятліка аддаць зямлю ў калгас – *усё роўна як аддаць душу*. У разуменні Васіля, *уся сіла чалавека – у зямлі. І сіла ўся, і радасць! Няма зямлі – няма, лічы, чалавека*. Зямля, нібы жывая, размаўляе з Васілём, просіць яго аб заступніцтве і абароне. Пад ціскам новых абставінаў чалавек бяссільны абараніць яе і, мабыць, упершыню здраджвае ёй. Пераараная па загадзе Міканора зарунелае Васілёва поле нагадвае пакалечаную жывую істоту, якая з дакорам звяртаецца да чалавека, што не здолеў абараніць яе ад гвалту. Страта зямлі ў традыцыйнай каштоўнаснай сістэме селяніна раўназначна грэхападзенню, што прыводзіць да разбурэння ўстойлівага палескага Эдэму. Усведамленне адлучанасці ад зямлі распачынае працэс адлучанасці чалавека ад прыроды, ад адказнасці перад ёю.

Сама прырода ў рамане, якая яшчэ цесна звязана з чалавекам, далучаецца да чалавечых трагедый і драматычных перажыванняў. Так, у год пачатку калектывізацыі *нібы прыпыніўся адвечны рух прыроды; восень адышла, а зіма не бралася як след*. У першым рамане «Людзі на балоце» прырода буяе ў сярэдзіне лета, затое ў рамане «Завеі, снежань» пачуцці чалавечыя стынуць, не атрымліваюць далейшага развіцця, быццам іх сціскае холад і няўтульны вецер марозіць чалавечыя эмоцыі.

Малюнкі разбурэння колішняй гарманічнай экасістэмы, самадастатковага свету Палесся, часам напоўнены сапраўдным катастрафізмам. Новае гвалтоўнымі рэфарматарамі ствараецца з цяжкасцю, больш усё разбураецца і нішчыцца. Так, на месцы разабранага Міканорам уласнага гумна засталіся стаяць толькі сохі. Гэты выгляд прыводзіць у жах яго старую маці: *На чырвоным заходнім небе сохі высіліся, як калкі з абсечанымі рукамі. Уздымалі абсечаныя рукі ў неба: быццам малілі ў неба заступкі, кары на бязбожных. Старая, чуючы, як разрываецца душа ад болю, страху і крыўды, пачала, хапаючыся, кідаць перад сабой крыжы… "Божачко, ты – усемагутны!.. Ты – разумнейшы за ўсіх! Памажы, парай!.. Дай розум ім!.. Навучы іх, неразумных!..* [5, с. 358].

Шматпланавы твор І. Мележа паказаў пачатак асноўнай экалагічнай праблемы сучаснасці, якая прыйшла на змену традыцыйна-сялянскаму стаўленню да прыроды, – антрапацэнтрызм, культ чалавека-спажыўца, утылітарызм і прагматызм, стаўленне да прыроды выключна як да крыніцы матэрыяльных дабротаў.

На поўную моц экалагічная праблематыка загучала ў беларускай літаратуры напрыканцы ХХ стагоддзя, калі на палескай зямлі свой згубны след пакінула спачатку бяздумная меліярацыя, а потым і мёртвавейнае дыханне Чарнобыля. Тое, што было і што сталася, тыя катастрафічныя перамены, якія адбыліся з прыродай і чалавекам, вызначылі тэматыку раманаў Віктара Казько «Неруш», «Хроніка дзетдомаўскага саду», «Бунт незапатрабаванага праху», аповесцей «Цвіце на Палессі груша», «Выратуй і памілуй нас, чорны бусел» і іншых.

Як і І. Мележ, В. Казько родам з Палесся, таму палеская тэма гучыць у творах абодвух пісьменнікаў вельмі асабіста і пранікнёна. «Палескую хроніку» І. Мележа і раман В. Казько «Неруш» лучыць удумлівы аналіз пераемнасці працэсаў разбурэння Палесся ў розныя перыяды савецкай гісторыі. У рамане В. Казько паказаны канчатковы вынік злачынных пераўтварэнняў Палесся, пачатак якіх так чуйна і прадбачліва вызначыў І. Мележ. Дакладней, праз колькі дзесяцігоддзяў В. Казько наканавана асэнсаваць далейшае імклівае знішчэнне той пракаветнай зямлі, якой некалі было Палессе, прааналізаваць непапраўныя змены ў духоўным абліччы свайго сучасніка, акрэсліць канчатковую катастрофу, апошнюю кропку якой, што будзе паказана пісьменнікам у наступных раманах, паставіць Чарнобыль як апафеоз самаўпэўненасці і тэхнакратычных захапленняў чалавека.

Калі ў «Палескай хроніцы» І. Мележа асноўнай прычынай знішчэння спраўнай экасістэмы чалавек–прырода была калектывізацыя, гвалтоўны сацыялагічны эксперымент, то ў рамане В. Казько «Неруш» разбуральнай сілай у духу часу выступае індустрыялізацыя, развіццё прагматычнай тэхнагеннай цывілізацыі. У рамане Казько высокі чыноўнік, аглядаючы маштабы меліярацыйных работ вакол вёскі Княжбор, з пафасам адзначае: *Тое, што адбываецца сёння на Палессі, можна параўнаць толькі з калектывізацыяй* [1, с. 226].

Матыў загубленага, знішчанага чалавекам Эдэму з’яўляецца ў рамане дамінуючым, ён вызначае ідэйна-мастацкую скіраванасць рамана, вобразную сістэму і асаблівасці паэтыкі. Звяртае на сябе ўвагу назва твора, «Неруш», – нешта нечапанае, некранутае ў сваёй першастворанасці. У рамане Казько гэта слова – кантэкстуальны сінонім Эдэму, першасвету, створанага Богам, у якім чалавек ад пачатку пачуваўся дастаткова ўтульна сярод іншых насельнікаў райскага месца, але потым падняў руку на гэту гармонію. Такая сапраўдная неруш, адзінства чалавека і прыроды, беззаганнае суладдзе

паміж стыхіямі, людзьмі, раслінамі, жывёламі, птушкамі і паказвае пісьменнік на пачатку рамана. У сакавітых, яркіх апісаннях спрадвечнага ладу жыцця вёскі Княжбор, раскошы некранутай прыроды ўжо адчуваюцца матывы наканаванасці, тугі пісьменніка па тым часе і па той зямлі, якую ўжо немагчыма аднавіць у першастворанным выглядзе. Гэта зямная гармонія засталася ў памяці аўтара, наступныя пакаленні яе на пабачаць, і таму пісьменнік імкнецца як мага паўней, разнастайней, з розных ракурсаў паказаць гэта паўнакроўнае, кіпучае, шматгалосае жыццё. У творы шмат лірычных апісанняў, аўтарскіх адступленняў, якія перадаюць яго ўласны позірк на Палессе. Асабістыя эмоцыі пісьменніка часам делегуюцца і героям рамана – Цімоху Махахею, дзеду Дзям'яну, Васку Барздыку, часткова і самаму складанаму і неадназначнаму герою – Мацвею Роўду. Часам цяжка правесці дакладную мяжу паміж плынню свядомасці персанажа і аўтарскай думкай.

Гэтаксама, як у раманах І. Мележа, у творы В. Казько перадаецца інтравертнасць, замкнёнасць Палесся. Невялікая вёска Княжбор, падобная на Курані і амаль адарваная ад цывілізацыі, пазначана на карце раёна невялікай кропачкай недзе ў самым нізе: *Княжбор і княжборцы толькі ніткай дарогі прашылі зямлю, звязаліся ёю з белым светам, але ж нітка гэта была вельмі нетрывалая* [1, с. 91]. Дзякуючы гэтай адарванасці, замкнёнасці прасторы тут і засталася выспачка нерушы, у якім жыццё ўсяго жывога адбываецца па законах вечнабыту. Пісьменнік паказвае аўтэнтычнае, некранутае жыццё вёскі, у якой жывуць, працуюць, кахаюць, ненавідзяць яго героі, некалькі разоў пазначыўшы, што *Княжбор ... жыў па-свойму, па сваіх законах* [1, с. 96]. Свет герояў акрэслены пракавечнай дубровай, лясамі, балотамі з Чортавай прорвай, азёрамі, рэчкай з васямнаццаццю старыцамі, у якіх *толькі сонца дасягае дна віроў і ям, ...дзе атабарыліся і раскашуюць вусатыя самы...*, дзе і сёння мо жыве балотны бык. Калі ў ваколіцы вёскі ступіла нага меліяратараў, гэта зямля, па словах аўтара, *расчынілася перад Мацвеем і Шахраем, як у першы дзень свайго стварэння*. Матыў зямнога Раю падкрэслены аўтарам не толькі ў апісаннях паўнаты жыцця палескай прыроды, але і асаблівым стаўленнем палешукоў да роднай зямлі. Княжборцы шчыра перакананы, што *калі ёсць на зямлі рай, няма яму лепшага месца, чым вось гэтае, дзе стаіць на беразе рачулкі яго вёска Княжбор, дзе побач лес і вада, дзе недалёка возера Княжае* [1, с. 68].

Свет княжборцаў арганічна ўбірае ў сябе такія паняцці, як сям'я, род, радня, продкі, памяць, прырода, не толькі як фізічнае, але і духоўнае асяроддзе. У разуменні найбольш чулага персанажа, Цімоха Махахея, прырода надзелена жывой душой – старыцы, рэчкі, дубравы, птушкі і рыбіны *як людзі дыхаюць, старэюць... І свет іх такі ж разумны, як і ў чалавека, а мо і разумнейшы яшчэ* [1, с. 70]. У свеце, дзе адначасова існуе такая

разнастайнасць форм быцця ўсяго жывога, увасоблена вышэйшая мудрасць, запускаюцца механізмы самарэгуляцыі, аднаўлення гармоніі і раўнавагі. Першаствораны зямны Эдэм – не матэрыяльнае, а духоўнае суладдзе ўсіх яго насельнікаў.

Для герояў рамана балота – дамінуючы кампанент навакольнага свету. Аўтар перадае не толькі прыгажосць і паэзію балота, але разам з тым імкнецца перадаць і цёмную архаічную філасофію багны як захавальніцы найстаражытнейшай хтанічнай таямніцы зямлі. Балота, дрыгва прысутнічае ў рамане як першаматэрыял, з якога пачынаецца спарадкаваны свет, бо з куламесы багны можна вырабіць усё астатняе: і зямлю, і ваду, яна захоўвае таямніцу зніклага Герадотава мора, пра якое нагадваюць адно што палескія чарапашкі. У гэтым праЭдэме існуюць яшчэ ў непадзеленым стане ўсе стыхіі, тут яшчэ разам Рай і Пекла. Па версіі герояў рамана, Чортава прорва звязвае свет і іншасвет. У гэтым іншасвеце, па той бок зямнога жыцця, працягвае сваё існаванне зніклы з гэтага боку мяжы свет, людзі, рэчы. Так, Мацей Роўда зачаравана ўглядаецца ў глыб Чортавай прорвы, і яму падаецца, што нешта з іншага боку таксама глядзіць, вывучае яго. Мацвей адчувае, што там, у прорве, нібы хаваецца невядомая планета. На той планеце вывучалі і яго, тэсціравалі, але ён *не здатны быў зразумець яго (тэст), ужываючы свае зямныя веды… не мог адкінуць, ступіць на новы круг не зямнога, лагічнага мыслення. Тут жа ўсё гэта было парушана, а калі і не парушана, то збудавана, выстраена ў іншай, пакуль не зразумелай яму паслядоўнасці* [1, с. 156]. Неспасцігальнасць балота вабіць пісьменніка. Апісанню хараства, стоенай магутнасці, загадкавасці балота прысвечаны многія старонкі рамана, бо балота паўстае носьбітам самой пракаветнай мудрасці зямлі, ад разгадкі якой чалавек па свайму неразуменню адмаўляецца; знішчаючы балота, ён нібы адразае свае карані, якія хаваюцца ў балотных глыбінях. Разгадка таямніцы становіцца сучаснаму чалавеку-прагматыку і рацыяналісту непатрэбнай, бо чалавек зрабіў выбар на карысць матэрыяльнага, хуткаплыннага, пераходнага.

У разбурэнні гэтага зямнога Эдэму зноў павінен чалавек. Калектывізацыя, якая разарвала духоўную сувязь чалавека з зямлёй, што паказаў І. Мележ, была аналогіяй першага грэхападзення чалавека. Меліярацыя як з’ява тэхнагеннай цывілізацыі – наступны грэх, які прывёў да канчатковай страты Раю, бо чалавек, дагаджаючы свайму нястрымнаму апетыту, жаданню спажываць больш і больш, бяздумна ўмешваецца ў прыроду, перарабляючы яе па законах прагматыкі. «Зонай знішчэння» называюць тэрыторыю меліярацыйных работ: *Усё жывое трэба было звесці, вынішчыць ад былінкі да дрэва, ад маліны да дуба. Вынішчыць, каб потым адрадзіць хлебным коласам, караваем, малаком і мясам* [1, с. 182]. У выніку, як паказвае пісьменнік, – разбурэнне маральнага імператыву, распад аксеалагічых

асноў чалавечага быцця, грэх бездухоўнасці. Як адзначыў М. Тычына, «В. Казько адзін з тых, хто ў ліку першых зафіксаваў у нашай літаратуры жахлівы працэс абмялення, “меліярацыі” чалавечай душы, калі чалавек перастае быць чалавекам, а беларус – беларусам» [7, с. 18].

Каб завастрыць праблему, даць чытачу магчымасць найбольш востра адчуць непапраўную катастрофу, якая адбылася на Палессі, пісьменнік свой твор будуе на кантраснасці. Шматлікія апісанні некранутай прыроды каля вёскі Княжбор супастаўляюцца з апісаннямі рэфармаванага чалавекам рукатворнага раю, скалечанай меліярацыяй зямлі. Знікае разнастайнасць зямлі і адчуванне паўнаты жыцця на ёй. Пейзаж пераўтвараецца ў сумны, аднастайны ландшафт з геаметрычна правільнымі палямі, на якіх каласіцца жыта, з правільнай сеткай меліярацыйных каналаў, з рэчкамі, закутымі ў бетон, якія нават павароты робяць пад правільным вуглом. Усё падпарадкавана розуму, логіцы чалавека, але выглядае прымітыўным у сваёй аднастайнасці. Нават у Роўды, чыімі рукамі праводзілася меліярацыя, *тугою агортвала сэрца, і захацелася хутчэй адвесці вочы і не бачыць іх* [1, с. 217].

В. Казько стварае мноства эпізодаў з сімвалічным падтэкстам. Вось Роўда і чыноўнае начальства едуць ва ўзорны палескі калгас і ніяк не могуць знайсці патрэбны паварот на дарогу, бо ўсё вакол аднастайнае і безаблічнае. Самотнае дрэва павінна служыць арыенцірам падарожнікам па гэтай «выпраўленай» зямлі, *але і гэта дрэва згубілася ў аднастайнасці палёў, і ім, пэўна, трэба было радавацца. А не радавалася. Душа прасіла лесу. Мо яна б і маўчала, не прасіла яго, калі б ведала, што лясоў тут ніколі не было* [1, с. 217]. Гэта дрэва-арыенцір яны, урэшце, знаходзяць, але яно быццам пазбаўлена жыцця, напаўзасохлае *ад спрамленасці і простасці, ад прамізны вуглоў і дарог, выстуненасці рэчак, сярод збудаванасці гэтых рэчак і багатых палёў і сенажацяў* [1, с. 220].

На змену натуральнаму прыходзіць усё штучнае, сурагатнае. Ва ўзорнай гаспадарцы, гэтым наствораным раі, каровы не скубуць траву на полі, куды іх аднойчы выгналі, бо прывыклі есці камбікорм з кармушак. Адбываецца парушэнне базавах прыроджаных інстынктаў – яны стаяць на полі і равуць ад голаду. Знішчаныя старыцы і азяркі, рачулкі і крынічкі замяняюцца фантанам на плошчы новай вёскі. Пракаветны зямны Эдэм пераўтвараецца ў прагматычна-рацыяналістычны рай, створаны рукамі і воляй чалавека.

У біблейскі Эдэм, нябесны райскі сад, згодна з замкнёна-цыклічным рухам часу, чалавек яшчэ мог вярнуцца і атрымаць свой некалі страчаны Рай. Як паказвае В. Казько, зямны Эдэм чалавек па сваёй неабачлівасці страціў назаўсёды. Ён паўстае не выгнанцам з Раю, а яго актыўным разбуральнікам. Таму агульная эмацыянальная танальнасць твора песімістычная, таму старонкі рамана насычаны шматлікімі малюнкамі скалечанай прыроды.

Меліярацыя на Палессі ў першыя гады яе ажыццяўлення прывяла да надзвычай высокіх ураджаяў. Так, у рамане апісваецца, як *зерне не паспявалі адвозіць ад камбайнаў, яго не было куды ссыпаць, не хапала такоў, павецяў, яго не паспявалі лапаціць і сушыць на сушылках* [1, с. 295]. Але не толькі хлебам ці сытасцю вызначаецца райскае жыццё. Некалі паўнакроўнае і разнастайнае жыццё пакідае Палессе, пісьменнік паказвае гэты сумны працэс памірання праз разнастайныя мастацкія дэталі. Старыя хаты княжборцаў пацiху развальваюцца, нібы іх пакідае жыццёвы дух, які нябачна трымаў іх, дапамагаў ператрываць паводку: адусюль цягне скразнякамі, пахіліліся сцены, печ, куты зарастаюць павуціннем, чарнеюць маснічыны на падлозе. Героі рэфлексуюць, жывуць успамінамі, супастаўляючы мінулае і сённяшні сыты рай.

Асабліва глыбокія перажыванні вярэдзяць душу Цімоха Махахея, не даюць магчымасці прыняць новае аблічча палескай зямлі, прыстасавацца да новай, палепшанай рэальнасці. Па старой памяці ён ідзе рыбачыць на раку, якой ужо няма, няма яе віроў, ямінаў, завоінаў – яны засыпаны. Ён не пазнае зямлі, роднага наваколля, хаця яшчэ нядаўна ад паўнаты і разнамаітасці жыцця радавалася душа Махахея: *Не яго зямля перад ім, а стаяла труна і ён развітваўся з тым, хто ляжаў у гэтай труне* [1, с. 240]. Менавіта да яго, надзеленага здольнасцю тонка і чула ўспрымаць прыроду, прыходзіць пачуццё віны і шкадавання не толькі скалечанай зямлі, а таго ненароджанага нашчадка, які ніколі не будзе ведаць таго, што было тут: *Што будзе адчуваць той, што ідзе за ім, калі ён, Махахей, і знаку ад гэтага следу не пакінуў, калі вакол толькі палі і палі – і на гэтых палях і вакол іх усё толькі для патрэбы, толькі для жывата. Ці не заные душа ў таго, які яшчэ не нарадзіўся,…але душа яму ўжо створана…І не з хлеба яна і булак, не з гарэлкі і віна…а і з самога Палесся трохі, з лясоў і балот яго, з рэчак і ручаёў, з вады* [1, с. 241]. Пісьменнік паказвае трагедыйнае разуменне непапраўнасці, незваротнасці ў душы свайго героя, якое прыйшло на змену адчуванню насычанасці свету, радасці жыцця, усведамленню вышэйшай гармоніі, разлітай у прыродзе.

Напачатку рамана В. Казько з захапленнем апісваў магутныя жыццёвыя сілы прыроды, пераемнасць розных форм жыцця, бясконцасць пераўтварэнняў, але цяпер, калі балоты засыпаны і пакрыты навастворанымі палямі з жытам і пшаніцай, адбылося знішчэнне самой крыніцы жыццёвай энергіі, парушэнне сакральнай таямніцы. Ва ўзніклага на балоце поля *адсечана памяць*, а ў міг яго стварэння *адбылося забойства*, а *на слязах другога шчасця не збудуеш*. Махахей адчувае, што нібы спыніўся на Палессі адвечны колазварот прыроды, перастаюць дзейнічаць былыя, заведзеныя нейкай неспасцігальнай вышэйшай воляй механізмы спрадвечнага руху, жыццё сцішылася, змялела і збяднела. Раней у Княжборы жыццё тварылася як бы само сабою па заведзенай схеме: *Недзе на зямлі ці на небе быў вынайдзены спецыяльны ключык, і тым ключыкам нехта, застаючыся сам нябачным,*

*час ад часу заводзіў яго і тых…* [1, с. 405]. Наваствораны свет Палесся стаў прымітыўна простым, адналінейным, падпарадкаваным разумным лагічным законам, у якім усё можна патлумачыць і апраўдаць. Знікла адчуванне вечнасці і неўміручасці, што было ў сапраўдным Эдэме. У наваствораным раі ўсё матэрыяльна, а значыць, часова, акрэслена немінучым канцом, і чалавек наноў адчуў сваю смяротнасць, як тады, калі быў выгнаны з Раю.

Прырода помсціцца чалавеку за памылкі. Запаведныя зоны, якія былі дзе-нідзе пакінуты, забалочваюцца, дрэвы гінуць, жыццё ў іх памірае. У гэтых пакінутых выспах лесу развялося мноства мошак, камароў і рознай погані, у Махахеевай дуброве грыбы звяліся, суніцы ды іншыя ягады выра-дзіліся. Адбываецца амаль біблейскі сыход з чалавечага раю ўсяго жывога: *Адплакаўшы сваё… пайшлі адсюль бабры… І пайшлі яны, як бежанцы… Глыбокай ноччу, у цемрадзі, захоўваючы ў тайне свой зыход, пайшлі ад сваіх абмялелых азёр і старыц ракі* [1, с. 248]. Не знайшоўшы на знішчаных дрэвах свае гнёзды, пакідаюць Палессе буслы – ачалавечаныя палешукамі птушкі, надзеленыя сакральным сэнсам несці любоў і дабро. Гэты сыход птушак, звяроў, рыб апісаны ў прытчавай форме і выклікае інверсійныя алюзіі на вядомыя словы Ф. Скарыны. Як слушна адзначае даследчыца Т. Нуждзіна, «ні коласаўскія, ні мележаўскія героі яшчэ не сутыкаліся з такім дзікім, жорсткім замахам чалавека, грамадства, дзяржавы на саму прыроду, на свя-тая святых – ваду, паветра, лес… На саму аснову жыцця беларуса» [6, с. 194].

Віктар Казько плённа займаецца міфатворчасцю, шырока выкарыстоўвае легенды, біблейскія матывы і сюжэты, якія дапамагаюць глыбей выявіць аўтарскую канцэпцыю, што дае падставу характарызаваць творчы метад пісьменніка як міфалагічны рэалізм. Вялікае эмацыянальнае напружанне ў рамане «Неруш» ствараюць сімваліка-алегарычныя вобразы балотнага быка, Галоскі-Галасніцы і Жалезнага Чалавека. Жалезны Чалавек – голас сум-лення, сукупнай чалавечай мудрасці, духоўнага вопыту продкаў. У рамане ён часта ўвасабляе аўтарскі голас пісьменніка, выказвае яго ўласную пазіцыю.

Чыімі ж рукамі знішчаецца Эдэм на Палессі? Асноўныя знішчальнікі дзеляцца на ідэолагаў і выканаўцаў. З найбольш паслядоўных ідэолагаў варта назваць чыноўніка Шахрая. В. Казько падкрэслівае яго інакшасць у параўнанні з палешукамі, яго духоўную неразвітасць і слепату, вынікам чаго ёсць неразуменне самакаштоўнасці палескай зямлі, глыбіннай таямніцы палескіх балот. Як і Башлыкоў у «Палескай хроніцы», Шахрай не разумее палескую вёску і вяскоўцаў, а да балотаў адчувае асабістую нянавісць. *У мяне алергія на балота*, – кажа ён Роўду. Адналінейнасць і нахрапістасць родніць яго з Башлыковым: *Мы перакройвалі адносіны, цяпер прыспеў час перакройваць зямлю. Таму і свет больш суровы*. Праўда, тут жа пазначае, якія жорсткія патрабаванні мае новы свет: *Есці, жраць, разумееш, свет хоча* [1, с. 87]. У сілу духоўнай абмежаванасці Шахраю не дадзена адчуваць ніякіх пакутаў сумлення.

У цэнтры ўвагі аўтара – жыццёвая і светапоглядная драма Мацвея Роўды, карэннага палешука, начальніка БМУ меліярацыі, а потым і княжборскага старшыні калгаса. Роўда як карэнны паляшук любіць і разумее стоеную мудрасць і прыгажосць балота, але разам з тым разумее і спрадвечную паляшуцкую праблему малазямелля, беднасці. Пераўтвараць зямлю ён імкнецца як быццам з высакародных памкненняў – палегчыць жыццё, накарміць людзей, даць болей хлеба. В. Казько глыбока паказаў трагедыю Мацвея Роўды, чалавека, які адчувае душэўны разлад і непрымірымы канфлікт паміж розумам і сэрцам. Розум кажа, што трэба хлеба, а сэрца трывожыць іншымі пачуццямі. Ён выдатна разумее, што балота забірае землі, якія маглі б радзіць хлеб, але яно прапануе годную кампенсацыю і шмат дае палешуку. У глыбіні душы ён баіцца меліярацыі, яна страшыць яго з юначых гадоў, калі ўпершыню пабачыў, як гарыць асушанае балота. Злавесныя вобразы пакалечаных і зваленых у кучу дрэў, чорная зямля, спавітая едкім дымам, выклікаюць у яго параўнанне з вайной. Пісьменнік праводзіць думку, што меліярацыя па сутнасці – вайна з прыродай, генацыд усяго жывога. Дым, які сцелецца над тарфяной зямлёй, выклікае асацыяцыі ў Роўды з тым, як гарыць вёска: *Дым слаўся нізам, як на папялішчы паўзалітай вадою хаты. І здавалася, што гэта менавіта так і ёсць: гарыць нечая хата* [1, с. 82]. Гэты эпізод адзін з многіх адступленняў, асацыяцый, уведзеных у канву рамана і пакліканых абвастрыць агульную ідэю твора. Прыгаданы Роўдам эпізод з юначай маладосці шматслойны і багаты на алюзіі: меліярацыя/вайна/пажар/знішчэнне дому, бо балота – дом для мноства жывых істот.

Свядомасць Мацвея Роўды пашыраецца ў рамане за кошт шматлікіх сноў, мрояў, трызненняў. Гэтыя снабачанні і відзяжы – голас здратаванай душы Роўды, затаптаных розумам пачуццяў. Яны сімвалічна-алегарычныя і выконваюць у творы канцэптуальную ролю. Так, у адным са сноў Роўда бачыць дзіўны дом, населены многімі пакаленнямі княжборцаў, у сцяне дома чырванню маліны гарыць цаглінка, да якой упарта цягнецца рука Роўды. *Не руш, не чапай цаглінку*, – крычаць галасы ў сне Роўды, паўтараючы асноўную ідэю рамана [1, с. 188]. Ён такі дастае гэту жывую цаглінку, якая аказваецца краевугольным каменем дома, і дом разбураецца, абвальваюцца сцены, дах, усё засыпаецца пяском. Гэты агульны для ўсіх пакаленняў дом разбурыў ён, Мацвей Роўда.

На гэта алегарычна-сімвалічны сон спраецыраваны эпізод з рэальнага ўчынку Роўды, які бачыцца не менш знакавым, чым умоўна-фантастычны сон. У зоне знішчэння, пасярод чорнага тарфянога поля застаўся лапік маліннік з духмянай ягадай, якая вабіць і начальства, якое прыехала з інспекцыяй, і рабочых. Гэты маліннік выклікае глухое раздражненне ў Мацвея, бо бачыцца як напамін пра жыццё, якое калісьці тут раскашавала, а зараз патрушчана, спляжана гусеніцамі трактароў. Гэты маліннік нібы нагадвае

пра злачынства, якое ён учыняе супраць жыцця, не дае спакою, і Роўда загадвае яго пераараць, што і выконвае трактарыст па прозвішчу Сюскін. Прозвішча гаваркое і паклікана паказаць нікчэмнасць чалавека, паслухмянага вінціка сістэмы знішчэння, але гэты дробны, паслухмяны і нічым не адметны чалавек узброены тэхнікай, машынамі і становіцца небяспечным знішчальнікам. Трактары, бульдозеры і іншая машынерыя з’яўляецца ў рамане ўвасабленнем дасягненняў чалавечага розуму, тэхнагеннай цывілізацыі, у якой адбываецца дэгуманізацыя чалавека. У апошнім сне трактар, на якім Сюскін пераараў маліннік, гоніцца за Мацвеем. Гэта машына, створаная розумам чалавека, выйшла з-пад яго кантролю, паўстала супраць свайго творцы, пагражае яму і ўсяму жывому. У сне Роўду судзяць пакаленні вёскі Княжбор і не жадаюць бараніць яго ад машыны, бацькі, якіх ён бачыць сярод памерлых, адмаўляюцца ад яго. Хаця чыноўніцкі суд яго апраўдаў, але няма апраўдання перад продкамі, аднавяскоўцамі, перад самім сабой. Роўду наканавана жыць далей з *веданнем неўратавальнасці*.

Прыёмы плыні свядомасці, якія ўжывае аўтар, дазваляюць далучыцца да працэсаў самааналізу Роўды, пошукаў віны і апраўдання, прычын зробленых памылак. Ён бачыць сваю першапачатковую віну ў тым, што не здолеў адкрыта выказваць свае пачуцці, самастойныя думкі, пасаваў перад начальствам, асмельваўся гаварыць выкрывальныя словы пра меліярацыю толькі сам сабе. Ён вінаваціць сябе за згодніцтва, нібы ўнутры яго падаваў голас той далёкі продак, які ціха пражыў свой век сярод балот з стагоддзямі культываваным пачуццём самазахавання. Цікавыя словы Віктара Казько, сказаныя ім у інтэрвью, што многія нашы праблемы паходзяць «з-за нашай празмернай сялянскай, мужыцкай даверлівасці і дасціпнасці. Мы пакутнікі і закладнікі ўласнага дамарошчанага і заскарузлага самападману, нашых пракаветных балот з іх спавівальнай багнай і дрыгвой, нязбытай памяццю пра нашы лясы і воды – пра мора Герадота, ад якога не можа пазбавіцца наша застыглая самасвядомасць» [2].

Такі грэх згодніцтва ляжыць на многіх героях рамана. Княжборцы нават за вялікія грошы не ідуць на меліярацыйныя работы да Роўды. А, напрыклад, работнікі рыбгаса ахвотна працуюць на меліярацыі, не шкадуючы здароўя, а дома клянуць яе апошнімі словамі. Палешукі асабліва не падтрымліваюць меліярацыю, але і не супрацьдзейнічаюць ёй. Усіх прымірыў хлеб. У рамане В. Казько хлеб перастае быць сакральным увасабленнем адухоўленай, стваральнай працы, становіцца сімвалам матэрыяльных каштоўнасцяў і ўваходзіць у кантэкстуальную апазіцыю духоўным патрэбам чалавека. Аўтар некалькі разоў у сваіх разважаннях-характарыстыках праводзіць гэту антыномію: *На хлеб, а не лес і ваду быў замкнёны і скіраваны ён, Мацвей Роўда* [1, с. 194]. Вобразная сістэма рамана будуецца на шэрагу апазіцый:

першаствораны Эдэм – рай рукатворны, прырода – машына, духоўнае – матэрыяльнае, прырода – хлеб, што адпавядае больш універсальнай апазіцыі натуральнае – ненатуральнае.

Пісьменнік укладае ў плынь разважанняў Цімоха Махахея думку пра тое, што людзі парушылі размеранасць і пастаянства ва ўзаемастасунках з зямлёй. Працяглыя гарманічныя адносіны з прыродай засноўваліся на размеркаванасці. Кожны браў столькі, колькі трэба было для спажытку, ведаючы, што ты не адабраў нешта ў таго, хто ідзе за табой. Зямля радзіла раней як магла, і ніхто не патрабаваў ад яе большага. *Зарукай бясконцасці была... размеркаванасць усяго, што можна было ўзяць сёння, на ўвесь век-тэрмін і на век-тэрмін усяго сутнаснага, каб у час разліку за усё, што ты ўзяў, ніхто не папікнуў, бы ты з'еў чыйсьці век, узяў і з'еў чужы кусок...Няма найвялікшага граху за той, калі ты абкрадзеш мёртвага і ненароджанага альбо таго, хто толькі-толькі нарадзіўся і яшчэ не здольны пастаяць за сябе* [1, с. 287]. Цяпер зямля дае суперхлеб, нечуваныя ўраджаі, але гэта злачынства, гвалт і разбурэнне прыроды, абкраданне наступных пакаленняў. Тэхнагенны прагматычны рай, пазбаўлены жывой душы, духоўнай асновы, таксама наканаваны на разбурэнне, бо ён уяўляецца толькі мёртвай абалонкай. Гэта разбурэнне прынясе з сабой чарговую катастрофу, бо людзям няма куды ўжо вярнуцца – яны падобны на беззямельных, бяздомных, беспрытульных пагарэльцаў. Так гарыць Махахеева хата, разбураецца дамок Нянене, зносяцца ўсе хаты княжборцаў, бо ім жыць цяпер у прамысловым сельскагаспадарчым раі.

Наканаванасць на выраджэнне, перарванасць жыцця сімвалічна паказана пісьменнікам у сцэне вяселля, што традыцыйна ўяўляецца апафеозам кахання, пачаткам новага жыцця. Гэта апошняе вяселле ў Княжборы, у старой хаце перад самым пераездам у новую вёску атрымалася апакаліптычным, як перад канцом свету, і больш падобнае на хаўтуры. У калодзежы, да якога па ваду падыходзіць нявеста, каб выканаць старадаўні абрад, няма вады. Усе яе спробы зачарпнуць хоць трохі безвыніковыя. Вада – устойлівы сімвал пачатку жыцця, а адсутнасць яе – страшны знак-вяшчун. Катастрофа немінучая. Але насоўваецца не толькі прыродная катастрофа, з ёй у звязку ідзе і духоўны распад асобы. На вяселлі сталася нечуванае: *сцягачы*, як вяскоўцы называлі прышлых з іншых краёў, скралі з каморы каравай і таму вяселле здаецца ўжо не сапраўдным, бо *не было караваю-раю*.

Апакаліптычнымі настроямі прасякнута канцоўка рамана. З зямлі знікла вада, сонца смаліць, але ўначы на азіміну выпадае іней, на палях раннія замаразкі, якіх ніколі тут не было. А на апошніх старонках рамана адбываецца апакаліптычнае разбурэнне ўжо новага, створанага чалавекам раю. На княжборскую зямлю абрынуўся тарфяны смерч. Вецер узнімае камячкі сухой тарфяной глебы і нясе прэч, канчаткова сціраючы след і

напамін пра былы зямны Рай прыроды: *Будуць ганяцца адна за адною пылінкі, дарэмна імкнучыся зноў легчы на зямлю, умацавацца на ёй, знайсці зноў сябе, не дадзена ім гэтага ўжо, як не дадзена чалавеку нарадзіцца двойчы… гэты пыл ужо не сабраць, не скласці, не аб'яднаць*. Цяпер і гэты рукатворны рай развейваецца на атамарным узроўні, а ў чалавеку застаецца толькі памяць пра першатворны Эдэм. *Раўла бура, кругамі круцілі смерчы, і па крузе ў гэтых смерчах, бы вялі нейкі карагод, хадзілі людзі, хадзіў бусел. Хадзілі, натыкаліся на Мацвея, крычалі нешта нячутнае яму і злое, яраснае. І вецер выў і крычаў у вушы галасамі княжборцаў:*

– *Быў лес…*

– *Была вада…*

– *І стала пекла. Пекла, пекла, пекла…* [1, с. 412]

Таксама сімвалічна, што на зямлю пасля буры лёг ранні снег. Ён як быццам накрыў мёртвае, скалечанае цела зямлі белай прасцінай, а з другога боку зямля пад ім адпачывае, назапашвае сілы, каб адрадзіцца наноў, але былога Эдэму не будзе ніколі. Раман «Неруш» – раман-папярэджанне, раман перадчарнобыльскі, твор, у якім гучыць трывога за памылковы шлях сучаснай тэхнагеннай цывілізацыі, якая вядзе да сапраўднай катастрофы, Апакаліпсісу, да дэгуманізацыі чалавека, знішчэння яго першасных духоўных каштоўнасцей.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Казько, В.* Выбраныя творы : у 2 т. / В. Казько. – Мінск : Маст. літ., 1990. – Т. 1: Неруш : раман; апавяданні. – 479 с.
2. *Казько, В.* Наша літаратура амаль цалкам некрафільская [Электронны рэсурс] /В. Казько. – Рэжым доступу : https://дз.ею/pub/arche/html/2007-10/kazko710.htm. – Дата доступу : 27.12.2022.
3. *Мележ, І.* Збор твораў : у 10 т. / І. Мележ. – Мінск : Маст. літ., 1981. – Т. 5: Людзі на балоце. – 415 с.
4. *Мележ, І.* Збор твораў : у 10 т. / І. Мележ. – Мінск : Маст. літ., 1981. – Т. 6: Подых навальніцы. – 408 с.
5. *Мележ, І.* Збор твораў : у 10 т. / І. Мележ. – Мінск : Маст. літ., 1982. – Т. 7: Завеі, снежань. – 558 с.
6. *Нуждзіна, Т.* Загадка Віктара Казько / Т. Нуждзіна // Полымя. – 1999. – № 2. – С. 192–206.
7. *Тычына, М. А.* Карані і крона: Фальклор і нацыянальная спецыфіка літаратуры / М. А. Тычына. – Мінск : Маст. літ., 1991. – 217 с.

*Матэрыялы артыкула друкаваліся [у] : Бурдзялёва, І. А. Матыў загубленага Эдэму ў «Палескай хроніцы» І. Мележа і рамане «Неруш» В. Казько / І. А. Бурдзялёва // Вестн. Мин. гос. лингвист. ун-та. Сер. 1, Филология. – 2013. – № 2 (63). – С. 95–103.*